**А.М. Ненадавец (Бабруйск)**

# “Казкі жыцця” Якуба Коласа: алегарычны паказ рэальнасці

Большасць алегорый напісана Я. Коласам у дарэвалюцыйны перыяд і прасякнута глыбокімі сацыяльнымі ідэямі і матывамі. Да твораў, адзначаных сацыяльнай накіраванасцю, можна аднесці “казкі”: “Жывая вада”, “У балоце”, “Адзінокае дрэва”, “Зло – не заўсёды зло” і іншыя. У іх пісьменнік імкнуўся растлумачыць прычыны няроўнасці сярод людзей. У гэтым сэнсе коласаўская “Жывая вада” з”яўляецца своеасаблівым працягам вуснапаэтычных твораў аб народным дабрабыце. Яна дае алегарычны адказ на адвечнае пытанне народа аб прапаўшым сялянскім шчасці. Сярод сялян бытавала многа паданняў, легенд, у якіх сцвярджалася, што раней усе народы былі роўныя, але “нейкая цёмная сіла пазайздросціла шчасцю людзей”, усё “засыпала жоўтым пяском”, зляцеліся “арлы” ды “каршуны”. Пад Жывой вадой, як лёгка здагадацца, падразумяваецца Беларусь, якая ў 1905–1907 гг. перажывала перыяд уздыму рэвалю.цыйнай і нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Пісьменнік імкнуўся данесці думку аб тым, што і беларусы маюць свае даўнія традыцыі, культуру, гісторыю, што іх духоўнае жыццё не спынілася. Аднак марудна выбіваецца наверх Вада, “паціхоньку размывае зямлю”: няма спрыяльных умоў для гістарычнага развіцця народа. Ён нагадвае, што “лапцюжная мужыцкая” мова некалі была ў пашане. Сацыяльны і нацыянальны ўціск змянілі твар зямлі: “Нават лес адмяніўся: старыя дрэвы даўно згнілі і ляжалі ў зямлі; а новыя былі нізкія, крывыя, няўдалыя…”. І яшчэ: “Людская жалоба, гора, пакута … паліліся цяпер са слязьмі адной хвалямі”. Аднак прыйшлі новыя часы. Толькі абуджаныя рэвалюцыяй сяляне адчулі сваю сілу. Сабрала Жывая вада “усе сілы свае і ўскалыхнула гару, як купіну”, “ажыло Мёртвае Поле”, і жыццё зноў “пайшло сваёю дарогаю”. Змест коласаўскіх “казак” адлюстроўвае сацыяльную рэчаіснасць таго часу. Аўтар, які імкнуўся не адлучаць самога сябе ад народа, хутка адклікаўся на штодзённыя праблемы, хацеў растлумачыць вясковаму жыхару сутнасць таго, што адбывалася навокал.

Публікацыя першых “казак” “Жывая вада”, “У балоце”, “Супраць вады” прыпадае на перыяд узмацнення рэпрэсій супраць абуджэння вольналюбівай думкі, дэмакратычнай літаратуры.

Важна, аднак, падкрэсліць, што хоць уплыў літаратурных традыцый на пачынаючага пісьменніка быў вельмі істотным, усё ж рашаючую ролю тут адыгралі народныя казкі. Нават сама форма “казак” Я.Коласа – міфапаэтычная, карані якой ідуць з казачнага эпасу. Аўтар запазычвае з фальклору матывы, мастацкія сродкі (гіпербалы, параўнанні, эпітэты і іншыя), звяртаецца да традыцыйных прыёмаў народных казачнікаў – усё для

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

таго, каб асэнсаваць складаныя жыццёвыя з’явы, каб такім чынам наблізіць свае “казкі” да чытача. Пісьменнік ідзе ў рэчышчы патрабаванняў казкі – персаніфікуе стыхійныя сілы прыроды, якія часта набываюць аблічча прыслужнікаў існуючага ладу, перасыпае творы фальклорна-сімвалічнымі вобразамі.

Крыніцай для сардэчнага болю і пакутлівых разважанняў пісьменніка быў кантраст моцных і слабых бакоў беларускага сялянства. Гэта супярэчнасць нараджала ў яго творчасці старонкі поўныя то лірычнага смутку, то шчымлівай нуды, то тужлівага гумару, то горкага абурэння. Матыў глыбокай любві да народа праходзіць праз многія творы Я.Коласа.

У некаторых “казках” аўтар імкнецца намаляваць і эксплуататараў і эксплуатуемых, паказаць перавагу другіх над першымі, падкрэсліць маральнае багацце бедных. Я.Колас глядзіць на несправядлівасць вачыма самога селяніна – галоўнага героя сваёй творчасці, – таму і спосабы, метады барацьбы за пераўтварэнне існуючага ладу абгрунтаваны, зыходзячы з сялянскага пункту погляду на жыццё. Напрыклад, у творы “У балоце” высмейваецца непрыстасаванасць паноў да жыцця, іх непрактычнасць і, адначасова, напышлівасць, прызнанне толькі свайго “Я”, сваёй слушнасці нават у тых пытаннях, у якіх яны амаль нічога не разумеюць. Трапілі ў балота і сядзяць, “як мурашкі на купіне сярод лужы”, паспрабавалі выбрацца самі ды не тут-тое было.

“Казка” “У балоце” – гэта і гарачая абарона бедных людзей, і выкрыванне багацеяў і іх прыслужнікаў, і прапаганда веры ў блізкі надыход таго жаданага моманту, калі шматпакутны народ вызваліцца ад тыранаў і пазнае сваю сілу, а эксплуататары ўсвядомяць сваю бездапаможнасць перад гэтай сілай. У адрозненне ад другіх твораў галоўнымі героямі тут з’яўляюцца не расліны, не рэчы і жывёлы, а мужыкі і паны – прадстаўнікі двух антаганістычных класаў. Праўда, яны не надзелены нейкімі індывідуальнымі, характэрнымі асаблівасцямі, у некаторых нават няма сваіх імёнаў, “… пытаў адзін барадаты ў другога вусатага (рыса фальклорнага партрэта), сяляне прымаюцца за працу без беганіны, спакойна разбіраюцца ў непаладках. Я.Колас упэўнены, што яны самі знойдуць шлях да свабоды, а што датычыць эксплуататараў, то “брычка і паны ўсё глыбей у гразь лезуць”.

Калі прасачыць па гадах час напісання і публікацыі коласаўскіх “казак”, то можна пераканацца ў тым, што іх ідэі і матывы з’яўляюцца своеасаблівым адлюстраваннем важнейшых падзей сацыяльнага жыцця Расіі і Беларусі таго часу: рэвалюцыя 1905–1907 гг., перыяд рэпрэсій, імперыялістычная вайна 1914 года… Пісьменнік імкнуўся адклікнуцца на кожную важную падзею, растлумачыць масам любое надзённае пытанне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самы агульны і асноўны сэнс праблематыкі некаторых “казак” заключаецца ў развіцці ідэі непрымірымасці класавых інтарэсаў у эксплуататарскім грамадстве, у развенчванні ўсялякага роду ілюзорных надзей на дасягненне сацыяльнай гармоніі мінуючы актыўную барацьбу з царскім гнётам, у імкненні ўзняць самасвядомасць прыгнечаных і абудзіць у іх веру ў асабістыя сілы. Напрыклад, у творы “Супраць вады” пад вобразам Старога Дзеда падразумяваецца “цар усяе Русі”.

Усё б здавалася, спакойна, ціха, усё на сваім месцы, але ўзнікае пытанне: “Ці задаволены былі тыя, каго апекаваў і над кім панаваў Дзед?”

Як і ў народных казках тут прысутнічаюць адданыя служкі цара – “лозы і алешыны”, гэтыя расліны і краскі – “магільныя крыжы для вады”. Яны дапамагаюць дзеду ўмацоўваць берагі, спадзеючыся  вытрымаць націск, але “воля згуртавання ўсіх азёрных сіл перамагла” і гледзячы, як перакульваецца Стары дзед у віры, сказала: “– Дурны, дурны дзед. Не воля аднаго, а воля ўсіх толькі і можа мець сілу і права” [1, с. 509].

У некаторых творах (“Жывая вада”, “Ручэй”, “Супраць вады”, “Чортаў камень”, “Кажух старога Анісіма”) прысутнічае сапраўдны казачны ўступ: “Ніхто не памятае таго часу, калі і як папаў сюды гэты камень. Самыя старыя людзі расказваюць, што яшчэ дзяды і прадзеды помняць яго” [1, с. 517]. Нікому з сялян не хочацца першым пачынаць барацьбу супраць каменя, пры гэтым знаходзіліся дзесяткі самых розных агаворак: “… Адны гаварылі, што чапаць камень – грэх; другія казалі, што на камень наложаны праклён і крануць яго боязна – можа здарыцца якое-небудзь няшчасце. Былі і такія людзі, якія проста сталі за тое, каб людзі вучыліся быць асцярожнымі і разумнымі; каб умелі самі абладзіць сваю бяду, сваё няшчасце, бо каб не было на свеце зла, дык кожны дурань лёгка трапіў бы ў рай. Прычына трэцяя – ніхто не ведаў добрага спосабу як узяцца за справу” [1, с. 517–518].

Матыў адной “казкі” ўнутрана звязаны з іншымі. Пісьменнік спрабуе растлумачыць, што дзеля таго, каб пакончыць з “чортавымі камянямі на сваім шляху, патрэбна аб”ядноўвацца, змагацца за лепшае будучае на роднай зямлі. Гэтая тэма найбольш поўна раскрыта ў творах “Хмарка”, “Ручэй”, “Даль”. У іх таксама ўзнімаецца і пытанне аб служэнні інтэлігенцыі свайму народу. Справа ў тым, што асноўная частка прадстаўнікоў “вясковых вярхоў”-выхадцы з саміх жа сялян, яны верай і праўдай служаць самадзяржаўю. Чалавек, які выйшаў з глыбіні народа, павінен аддаваць сваю энергію на карысць таго ж беднага люду, іншага шляху для яго пісьменнік не ўяўляе. Такі кароткі сюжэт “казкі” “Хмарка”.

Адзначым, што далёка не ўся інтэлігенцыя, абуджаная рэвалюцыйнымі падзеямі, стала на бок народа. Я.Колас асабліва перажываў за тых, хто так і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

не змог знайсці правільнага прымянення сваім сілам, таленту дзеля таго, каб служыць працоўным, прыносіць ім карысць. Аб гэтым вядзецца гаворка ў “казцы” “Крыніца”. Аўтар малюе Гару-Маці, якая многа пабачыла на сваім вяку і ў цяжкую хвіліну дае наказ дачцэ. Гара скардзілася, што толькі людзі і то не ўсе, “а самыя смелыя, самыя разумныя з іх, што пільна і пранікнёна ўглядаюцца ў кнігу жыцця зямлі, могуць трошкі разбірацца ў гэтых справах” [1, с. 501].

У разглядваемай “казцы” Я. Коласа адчуваецца непасрэдная сувязь з вуснай народнай творчасцю. Толькі калі народныя казачнікі гіпербалізавалі задачы, што стаялі перад персанажамі твораў, дзеля таго, каб больш прыгожа, каларытна намаляваць паядынак, пір, то Я.Колас выкарыстоўвае гэты прыём для больш праўдзівага паказу сялянскіх нястач і гора бедных людзей. У яго няма традыцыйнага ўпрыгожвання твора, няма “шчаслівага свету” – яго “казка”, наадварот, з”яўляецца адбіткам суровай рэчаіснасці. Гэта пацвярджаецца не толькі тым, што рэальны элемент у творах пісьменніка ўладарыць над ёю, але і тым, што сама гэтая фантастыка не адводзіць ад рэчаіснасці, а толькі служыць сродкам ідэйна-мастацкага пазнання і сатырычнага высмейвання адмоўных з”яў грамадскага жыцця.

Пісьменнік на прыкладах з жыцця прыроды малюе карціны рэчаіснасці. Ён заклікае не верыць у ілюзіі, а імкнуцца пазнаць ісціну, якой бы суровай яна ні была. Тут аўтар супрацьпастаўляе сваю пазіцыю пісьменніка-рэаліста поглядам эстэцкі-дэкадэнцкім. Яны (дэкадэнты) стваралі неіснуючы свет “цудаў”, выступалі за “чыстае” мастацтва, імкнуліся адарваць чалавека ад сапраўднага. У гэтых адносінах найбольш характэрны “казкі” “Балотны агонь”, “Чыя праўда”, “Што лепш”, “Даль”.

Бясспрэчна, пісьменнік многае запазычыў з фальклору, у прыватнасці, з сацыяльна-бытавых казак. Прыклады тычыліся быту, працы, адпачынку жыхароў. Але патрэбна адзначыць і тое, што праводзячы такія паралелі з вуснай народнай творчасцю, мы не знойдзем у творах Я. Коласа матываў, якія б пераклікаліся з гераічным эпасам. У фальклоры яго прыцягвае вобраз простага працаўніка, мужыка-земляроба. “Казкі” пісьменніка ўсялялі людзям дух упэўненасці, бадзёрасці, радаснага прыняцця барацьбы за справядлівасць, яны падтрымлівалі ў сялян веру ў перамогу, у канчатковы трыумф сацыяльнай справядлівасці.

Часам аўтар паказвае адвечныя працэсы, што адбываюцца ў прыродзе, калі на змену старому прыходзіць новае, захапляючы ўсё аджыўшае ў свае “касцяныя рукі смерці” (“Чыя праўда”). Я. Колас падае гэтую навіну старога дуба пасля апісання прыгожай карціны вясенняга пейзажу, супастаўляючы, такім чынам, адвечную тэму фальклору – тэму жыцця і смерці. Патрэбна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заўважыць, што пісьменнік не адступіўся ад народнай традыцыі: як не страшаць словы дуба, але ўспрымаюцца дрэвамі безагаворачна. Лёс, які суправаджае людзей заўсёды і ўсюды, пераносіцца аўтарам з жыцця грамадства і ў свет прыроды.

Некаторыя творы гэтага цыклу напісаны пад уплывам рускіх пісьменнікаў. У прыватнасці, у “казцы” “Камень” знойдзем знаёмы сюжэт алегорыі М. Салтыкова-Шчадрына “Асілак”. Аднак патрэбна падкрэсліць, што коласаўскі твор мае па-свойму глыбокі сацыяльны падтэкст, які дазваляе “прадчуваць” грандыёзныя падзеі. Уся прырода – лес, птушкі – адчувае не толькі прыгажосць свету, але і перажывае, пакутуе, спадзяецца, блізка да сэрца ўспрымае як пагібель дрэў, так і смерць людзей.

Ва ўсім наваколлі шчаслівы быў толькі камень, “так зглажыліся і так згадзіліся яго суседзі”. Ён і “месца выбраў прыўдалае” і “ляжыць сабе, як пан, нічым не займаючыся, і “лясная жаваранка прылятае сюды начаваць і пяе такія прыгожыя песні” [1, с. 488]. Валун ніколі не выказваў сваёй радасці і гэтая яго рыса служыла прадметам для пастаянных размоў. Прайшоў некаторы час і суседзям каменя стала зразумела, што не пасіўныя назіральнікі патрэбны прыродзе, а тыя, хто змагаецца, супрацьпастаўляе сябе стыхіям, мужнее ў гэтай барацьбе. Тут свае законы, ідзе прыродны адбор: хілае – гіне, моцнае. Вынослівае – застаецца. Толькі ў такім працэсе можна пазнаць жыццё.

У некаторых творах Я. Колас паказвае людзей, якія многа гавораць, але нічога не робяць, абяцаюць, але не выконваюць. “Мякка сцелюць – цвёрда спаць”, – так характарызуюць іх у народзе. Пісьменнік імкнуўся паказаць, дзе сапраўдныя сябры, а дзе проста “славесныя спадарожнікі”. Гэтай тэме прысвечаны твор “Адзінокае дрэва”. Аўтар глядзіць на прыроду з пункту гледжання “сялянскай філасофіі”, “бо і дрэва мае свой воблік”.

Родныя палі і лугі – гэта своеасаблівыя вымярэнні жыцця простага селяніна, які з часам пачынае разумець сутнасць падзей, што адбываюцца навокал, становіцца здольным на свядомую барацьбу супраць існуючага ладу. Я. Колас адным з першых у новай беларускай літаратуры паспрабаваў растлумачыць прычыны развязвання вайны – самай страшнай з”явы ў гісторыі чалавецтва. “Асінае гняздо”, “Стары лес” прысвечаны гэтай праблеме.

Разглядаючы ўплыў вуснай народнай творчасці на “Казкі жыцця”, неабходна адзначыць, што асобныя эпізоды, мастацкія сродкі ў некаторых з іх пераклікаюцца з фальклорнымі ўзорамі, у прыватнасці, з беларускімі народнымі казкамі. Гэта гаворыць пра тое, што пісьменнік свядома імкнуўся наблізіць свае творы да шэдэўраў вуснай народнай творчасці. Ён умела

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкарыстоўвае стыль народнага маўлення. Напрыклад, параўнанні: “Ляжыць сабе, як пан, у мяккім доле”, “Латкі чапляліся адна за адну, то як кастры, то як кучкі медзякоў”. Для алегорый характэрна і слушнае выкарыстанне слоў з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі: “каля саменькага карэння”, “баламуціць дубовых сынкоў”, “кожны кусцік”, “кожная саломінка”, “беленькі камячок”, “маладая бярэзінка”, “раскінуўся астравок”, “маладая травіца”, “яснае сонейка”. Сустракаецца і традыцыйна-фальклорны зачын: “Даўным-даўно, не за нашу памяць гэта было, шчаслівы то быў куточак белага свету…” [1, с. 476] і заканчэннем “казак”: “І да гэтага часу вядуць дрэвы спрэчку…” [1, с. 496]. Зрэдку Я. Колас выкарыстоўвае выклічнікі: “І ні тпррру! Ні но!” [1, с. 474], умела запазычвае эпітэты, характэрныя для беларускіх песень і казак: “пахучыя галоўкі”, “людская жалоба”, “крумкач-гарапашнік”, “смелыя людзі”, “ураджайны грунт”, “размовы-шэпты”, “бедныя палоскі” і іншыя.

Прыведзеныя прыклады сведчаць пра тое, што ствараючы “Казкі жыцця”, Я. Колас многае браў са скарбонкі вуснай народнай творчасці, выкарыстоўваючы фальклорныя ідэі і вобразы, уласцівы фальклору спосаб мастацкага абагульнення, народны пункт погляду на свет. І гэта не толькі не аддаляла яго ад рэчаіснасці таго часу, але і садзейнічала глыбокаму пранікненню ў яе сацыяльныя слаі, асэнсаванню актуальных пытанняў эпохі.

Літаратура

1. Колас, Я. Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ., 1975. – Т. 5. – 560 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ